Падтрымай "Вясну" на PATREON

Што гэта было? У Віцебску ў суботу суды цягнуліся да апоўначы

01.02.2021 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



суд Першамайскага раёна Віцебска.

У Віцебску 30 студзеня прайшоў працэс, які мусіць увайсці ў гісторыю беларускага судаводства.

Суддзя **Вераніка Барысава** ў выязным паседжанні ў будынку Першамайскага РАУС Віцебску да поўначы разглядала справу 13 віцяблян, абвінавачаных паводле арт. 23.34 КаАП. **Дзевяці чалавекам прысудзіла па 15 сутак арышту, чатыром – велізарныя штрафы,** паведамляе "Віцебская Вясна".

Пра прысуды, вынесеныя **Веранікай Барысавай**, паведамілі адвакаткі, якія выйшлі з будынку Першамайскага РАУС ужо **апоўначы** 31 студзеня. Па словах адной з іх, такіх працэсаў яна яшчэ ніколі не бачыла.

Паводле адвакатак, справы 13 чалавек былі аб'яднаныя ў адзін працэс, які пачаўся ў актавай зале РАУС прыкладна а 15-й гадзіне (затрыманых прывезлі ў РАУС значна раней, не даўшы паснедаць у ІЧУ) і цягнуўся да поўначы. Некалькі разоў абвяшчалі перапынкі, бо людзям станавілася блага, і яны прасілі выклікаць хуткую дапамогу. Па сведчаннях сваякоў і паплечнікаў затрыманых, якія больш за 12 гадзін чакалі выніку суду каля пастарунку, «хуткая» прыязджала як мінімум 5 разоў.

Людзей, якія чакалі пад аддзяленнем міліцыі, на суд не пусцілі. Супрацоўнікі МУС патлумачылі чакальцам, што *«суд адкрыты, але праходзіць на тэрыторыі рэжымнага аб'екту, таму трапіць на яго не ўдасца»*.

Пасля таго, як стала вядома, што большасць асуджаных застануцца пад вартай, іх сваякі спрабавалі перадаць ім перадачы з харчамі і адзеннем, але міліцыянты браць адмовіліся. Спасылаліся на тое, што ўсіх затрыманых 30 студзеня кармілі. Між тым, жанчыны, якім прысудзілі штрафы і якія выйшлі з РАУС ужо за поўнач, сцвярджалі, што ў пастарунку ніхто іх не карміў – адзінае, далі магчымасць падсілкавацца тым, што было пры сабе.

Алена Жыхарская, Ніна Скрыпец, Святлана Скакун і Ганна Куліева прысуджаныя да штрафаў **ад 30 да 50 базавых велічынь**. Яны правялі трое сутак пад вартай і зараз знаходзяцца на волі.

Адна з жанчын, вызваленая ўначы, расказала, што ўсіх прызналі вінаватымі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве («размахвалі сцягамі», «выкрыквалі лозунгі»), хаця ніякіх відэадоказаў вінаватасці міліцыянты ў суд не падалі. Пратаколы складаў маёр **Вадзім Склімянок**. «Суткі» ад Барысавай атрымалі нават тыя, хто прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці ўпершыню (ч.1 арт. 23.34).

Астатнія ўдзельнікі суботняга працэсу ў Першамайскім РАУС асуджаныя на 15 сутак арышту і былі этапаваныя з пастарунку ў віцебскі ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ), які месціцца зараз у будынку СІЗА-2. Гэта **Караліна Цярэнцьева, Андрэй Кулакоў, Аляксей Санько, Алег Рубін, Юрый Міхейцаў, Дзмітрый Карняенка, Ігар Ісакоўскі, Казлоў і дзяўчына**, прозвішча якой высвятляецца.

Большасць з пералічаных затрымалі 27 студзеня каля 22-х гадзін у мікрараёне Тарны нібыта за акцыю, якую хацелі зладзіць. Сярод затрыманых аказаліся цалкам выпадковыя мінакі – спадар Казлоў з сяброўкай, якую пайшоў праводзіць да дому (абодвум таксама прысудзілі па 15 содняў арышту).

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

